# КАНТРАСТЫ «ВЯСЁЛКАВАЙ КРАІНЫ»

## Чым адметная Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка?



**Бежанцы з Блізкага Усходу і Паўночнай Афрыкі сталі насамрэч галаўным болем для Старога Свету. Сюды перамяшчаюцца мільённыя хвалі перасяленцаў. Галоўная прычына міграцыі — беднасць, якая трымаецца ў свеце, яна прыводзіць да ўзброеных канфліктаў і вымушаных уцёкаў людзей у бяспечныя месцы, лічыць прэзідэнт Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі Джэйкаб Зума. Аб гэтым ён заявіў падчас панэльнай дыскусіі ў ААН. Зума таксама паведаміў цікавы факт: афрыканскія бежанцы накіроўваюцца не толькі ў Еўропу, але і ў ПАР, якая з'яўляецца вядучай эканомікай кантынента. Што ж цяпер адбываецца ў гэтай далёкай краіне?**

### ЧОРНЫЯ І БЕЛЫЯ

У XVII стагоддзі галандскія каланісты заснавалі тут невялікае паселішча і ў хуткім часе прызналі паўднёвыя берагі Афрыкі сваёй другой радзімай. Супольнасць бураў (гэтае слова па-галандску азначае «селянін») разрасталася, у пошуках спрыяльных умоў для гандлю і земляробства многія з іх асвойвалі новыя землі. У той жа час тут пачалі асядаць каланісты з Англіі. Адносіны паміж «старымі» і «новымі» еўрапейскімі пасяленцамі не заладзіліся з самага пачатку. У 30-х гадах XIX стагоддзя буры пасля ўзброеных сутычак з новапрыбыўшымі англічанамі вырашылі адправіцца ў падарожжа. Так званае Вялікае перасяленне прывяло іх на берагі Аранжавай ракі, дзе яны знайшлі ўрадлівыя пашы. Але мінула паўстагоддзя і адгрымелі адразу дзве англа-бурскія вайны, у якіх палегла нямала брытанцаў і галандцаў. Толькі ў 1910 годзе нідэрландскія і брытанскія калоніі прымірыліся і заснавалі Паўднёва-Афрыканскі Саюз, які праз 40 гадоў стаў незалежнай Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Так пачалася сучасная гісторыя гэтай дзяржавы.

Вызначальным пунктам у найноўшых часы для ПАР стаў расавы канфлікт паміж чорнай большасцю і белай меншасцю насельніцтва. Сваёй кульмінацыі ён дасягнуў пасля таго, як у 1948 годзе быў усталяваны рэжым апартэіду, які праіснаваў да1990-х. Ініцыятарам увядзення дыскрымінацыйных законаў стала Нацыянальная партыя. Гэтая палітыка прывяла да доўгай і крывапралітнай барацьбы, у якой вядучую ролю адыгралі чорныя актывісты, такія як Стыў Біко, Дэсманд Туту і Нэльсан Мандэла. Пазней да іх далучыліся многія белыя, нашчадкі змешанага насельніцтва, а таксама паўднёваафрыканцы індыйскага паходжання. Пэўную ролю ў краху апартэіду адыграў таксама ціск з боку міжнароднай супольнасці.

Адной з прыкмет тых часоў стаў велізарны сацыяльны разрыў паміж нашчадкамі еўрапейцаў, якія жылі па найлепшых стандартах заходняга свету, і большасцю, якая жыве ў беднасці (праўда, далёка не такі глыбокі, як у многіх іншых дзяржавах Афрыкі). Усё гэта выклікала пратэсты, забастоўкі і хваляванні ўнутры краіны, пікі якіх выпалі на сярэдзіну 1950-х, пачатак 1960-х, сярэдзіну 1970-х і 1980-я гады. У верасні 1989-га прэзідэнтам краіны быў выбраны Фрэдэрык дэ Клерк, які пачаў ажыццяўляць актыўныя дзеянні па ліквідацыі сістэмы апартэіду (белае насельніцтва павінна было адмовіцца ад свайго пануючага становішча). Многія законы адмянілі, з турмы выпусцілі Нельсана Мандэлу. У 1994-м прайшлі першыя ўсеагульныя выбары, перамогу на якіх атрымаў Афрыканскі нацыянальны кангрэс (АНК — дарэчы, дагэтуль знаходзіцца ва ўладзе).

Змена палітычнай сістэмы адбылася параўнальна мірна. Дарэчы, Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка — адна з нямногіх краін кантынента, дзе ні разу не быў ажыццёўлены дзяржаўны пераварот. Новую ПАР часта называюць «вясёлкавай краінай». Гэты тэрмін быў прыдуманы арцыбіскупам Дэсмандам Туту (і горача падтрыманы Нельсанам Мандэлам) як метафара новага, рознакультурнага і шматнацыянальнага грамадства, якое пераадолела падзел, што ўзыходзіць да эпохі апартэіду. ПАР з'яўляецца адной з самых нацыянальна разнастайных краін Афрыкі і мае найбольшую долю белага, азіяцкага і змешанага насельніцтва на кантыненце.



### БАГАТЫ КРАЙ

ПАР — найбольш развітая дзяржава на кантыненце і адначасова адзіная афрыканская краіна, якую не адносяць да «трэцяга свету». ВУП на 2015 год, паводле даных МВФ, склаў $313 млрд (33-е месца ў свеце). З усіх краін G-20 найбольшы прырост экспарту ў II квартале назіраўся менавіта ў ПАР — плюс 16,2%. Поўдзень Афрыкі — адзін з найбольш багатых на карысныя выкапні рэгіёнаў планеты. Не толькі па разнастайнасці, але і па запасах цэлага шэрагу мінералаў ПАР займае першае або адно з вядучых месцаў у свеце. Паводле афіцыйных даных, яе доля ў сусветных запасах марганцу складае 82%, металаў плацінавай групы — 69%, храміту — 56%, золата — 40%, ванадыю — 33%, цырконію — 26%. Доля ПАР у сусветных запасах многіх іншых важных мінералаў таксама значная. На тэрыторыі краіны сканцэнтраваны і запасы алмазаў, азбесту, нікелю, свінцу, урану, іншых важных карысных выкапняў. Большая частка паўднёваафрыканскіх радовішчаў унікальная па ўмовах і маштабах здабываемых рэсурсаў. Сваім апераджальным развіццём ПАР шмат у чым абавязаная багаццю прыродных рэсурсаў. Каля 52% экспарту прыпадае на прадукцыю горназдабыўной прамысловасці.

Шырока развіты тэлекамунікацыі, электраэнергетыка, электроніка, фінансавая сфера. Паколькі на большай частцы тэрыторыі краіны засушлівы клімат, толькі 15% яе плошчы прыдатна для вядзення сельскай гаспадаркі. Аднак у адрозненне ад большасці іншых дзяржаў Афрыкі, дзе адбываецца эрозія глебы, у ПАР з мэтай аховы палеткаў і арганізацыі эфектыўнай сельгасвытворчасці прымяняюцца перадавыя агратэхнічныя дасягненні. Гэта прывяло да цудоўных вынікаў: краіна цалкам забяспечвае ўнутраныя харчовыя патрэбы, а таксама з'яўляецца адным з вядучых (а па некаторых параметрах і асноўным) пастаўшчыкоў сельгаспрадукцыі. Напрыклад, экспартуе каля 140(!) відаў садавіны.

### 10 МІЛЬЁНАЎ МІГРАНТАЎ

Па колькасці насельніцтва Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка знаходзіцца на 26-м месцы ў свеце: у краіне пражывае каля 52 мільёнаў чалавек. Колькасць белых паступова памяншаецца за кошт іх эміграцыі ў Паўночную Амерыку, Еўропу, Аўстралію і Новую Зеландыю. У 1985—2005 гадах з ПАР з'ехала каля мільёна белых, у асноўным ва ўзросце да 40 гадоў і іх дзеці. Доля чорнага насельніцтва ПАР расце за кошт прытоку мігрантаў з іншых краін Афрыкі.

У пачатку XXI стагоддзя тут вельмі востра паўстала праблема нелегальнай міграцыі. Пасля адмены рэжыму апартэіду і значнага паслаблення кантролю на знешніх межах у краіну хлынуў паток нелегалаў з Зімбабвэ, Анголы, Мазамбіка і іншых краін Усходняй Афрыкі. Паводле розных ацэнак, у ПАР абасноўваліся да 10 мільёнаў мігрантаў. Масавы прыток замежнікаў выклікае незадаволенасць мясцовых жыхароў. Прэтэнзіі да мігрантаў заключаюцца галоўным чынам у тым, што яны адбіраюць у грамадзян ПАР працоўныя месцы, згаджаючыся працаваць за больш нізкую зарплату, а таксама здзяйсняюць злачынствы.

На працягу апошніх двух дзесяцігоддзяў колькасць насельніцтва краіны амаль не змяняецца (невялікі рост) з-за вялікага распаўсюджання ВІЧ, а таксама скарачэння колькасці белых. Першы перапіс у 1911 годзе ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы паказаў, што белых на той момант было 22%, а да 1980-га гэты паказчык знізіўся да 18%. Сярэдняя працягласць жыцця невысокая: 50 гадоў у мужчын, 48 — у жанчын. Сярэдні даход насельніцтва набліжаецца да ніжняй мяжы сярэднесусветнага паказчыка. Аднак у цэлым эканамічнае становішча грамадства вельмі няўстойлівае. У ПАР беспрацоўе складае 40%. Трэць работнікаў зарабляюць менш за 2 долары ў дзень.

Рэжым апартэіду, які панаваў тут доўгі час, і папярэдні каланіялізм адбіліся на сацыяльна-маёмасным расслаенні грамадства. Мільёны чорных паўднёваафрыканцаў да гэтага часу жывуць у беднасці. Гэта звязана з тым, што з-за гістарычных прычын па ўзроўні адукацыі, сацыяльнай адказнасці і прадукцыйнасці працы большасць карэнных чарнаскурых афрыканцаў цяпер аб'ектыўна няздольная адпавядаць стандартам развітога постіндустрыяльнага грамадства. Далёка не ва ўсіх жыхароў ёсць электрычнасць і водазабеспячэнне, а дрэнныя санітарныя ўмовы ў многіх паселішчах спрыяюць распаўсюджванню розных захворванняў. Такія рэзкія кантрасты прыводзяць да напружання сацыяльнай абстаноўкі. У ПАР вельмі высокі ўзровень злачыннасці, адзін з самых высокіх у свеце. У асноўным трывожная крымінальная абстаноўка характэрная для бедных раёнаў.



### АПАРТЭІД НААДВАРОТ

У Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы прыняты закон, які абавязвае белых фермераў прадаваць сваю зямлю карэннаму насельніцтву па фіксаванай цане, без магчымасці гандлю і адмовы ад здзелкі. Улады вырашылі такім чынам ажывіць працэс перадачы ўгоддзяў, якія былі ў свой час «скрадзены» ў чорных грамадзян краіны белай меншасцю. Ініцыятарам прыняцця гэтага дакумента з'яўляецца кіруючая ў краіне партыя «Афрыканскі нацыянальны кангрэс». У спецыяльнай заяве, выпушчанай АНК пасля галасавання ў парламенце, гаварылася, што закон «прадвяшчае новую эру ў праграме размеркавання зямлі, якая прынясе доўгачаканую справядлівасць бяздольнай большасці паўднёваафрыканцаў».

Дарэчы, пераразмеркаванне зямельных надзелаў у краіне пачалося яшчэ ў 1994-м, але тады здзелкі здзяйсняліся па ўзаемнай згодзе — белы фермер-прадавец меў магчымасць таргавацца з нагоды кошту сваёй зямлі. Тры гады таму прэзідэнт ПАР Джэйкаб Зума вырашыў мадэрнізаваць працэдуру і надаць працэсу новы імпульс. Пры гэтым працэс змены ўласнікаў зямлі быў неспакойны. З 1997 па 2007 год былі забітыя 1248 белых фермераў і наёмных сельгасработнікаў. Не дзіўна, што фермеры актыўна ўзбройваюцца. На гэтым фоне аднавілася падпольная дзейнасць тайных таварыстваў. На чале новага белага супраціву ПАР аказаліся маладзёжныя лідары, уключаючы папулярных рокераў, якія спяваюць на мове афрыкаанс (напрыклад, Бок ван Блерк і Стывен Хофмер).

Зямельную «рэстытуцыю» многія называюць не інакш, як «апартэід наадварот». Між тым, дыспрапорцыя сапраўды існуе. Белай меншасці (каля 8,5 працэнта насельніцтва краіны) дагэтуль належыць больш за палову ўсіх сельскагаспадарчых палеткаў дзяржавы. Пры гэтым не варта забываць: 11,5 тысячы фермерскіх гаспадарак забяспечваюць прадукцыяй не толькі 52-мільённае насельніцтва краіны, а і экспартныя пастаўкі. Хоць аўтары ініцыятывы сцвярджаюць, што рэалізацыя закона павінна аднавіць сацыяльную і гістарычную справядлівасць, яе праціўнікі асцерагаюцца, што практычнае яго выкананне прывядзе да чарговай хвалі сутыкненняў і гвалту паміж фермерамі і экспрапрыятарамі. Аналагічны закон, які працуе ўжо некалькі гадоў у суседнім Зімбабвэ, прывёў да голаду і масавых уцёкаў адсюль белых фермераў. Таму перспектывы «вясёлкавай краіны» выглядаюць насамрэч трывожна.

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*

